**ТРЫУМФ СТУДЭНТА БДУ: АНТЫВІРУС VINSAFE ПРЫЗНАНЫ НАЙЛЕПШАЙ РАСПРАЦОЎКАЙ ГОДА**
Антывірус VinSafe прызнаны найлепшай распрацоўкай года
Стар. 2

**«УНІВЕРСІТЭТ – ГЭТА МАЯ ЛЮБОЎ»**
Інтэрв'ю з акадэмікам НАН Беларусі, доктарам філасофскіх навук, прафесарам Яўгенам Бабосавым
Стар. 3

**НАВУКОЎЦЫ БДУ СТАЛІ ЎЛАДАЛЬНІКАМІ ГРАНТАЎ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ НА 2026 ГОД**
Распавядаем пра іх праекты
Стар. 4-5

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

29 студзеня 2026 года, №1 (2905)

# ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ: АНДРЭЙ КАРОЛЬ ПРА ГАРЫЗОНТЫ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У БДУ

**Андрэй Дзмітрыевіч, пра якія прыярытэты і дасягненні ўніверсітэцкай навукі мы можам гаварыць сёння?**

Універсітэт уносіць значны ўклад у развіццё айчыннай і сусветнай навуковай думкі, абапіраючыся ў сваёй дзейнасці на запыты часу і патрэбы эканомікі Беларусі. Навукоўцы ВНУ праводзяць даследаванні па ўсіх прыярытэтных і стратэгічна значных напрамках – ад лічбавых і касмічных тэхналогій да сельскай гаспадаркі, медыцыны і забеспячэння гуманітарнай бяспекі чалавека.



У мінулым годзе БДУ дасягнуў значных навуковых вынікаў. БДУ захоўвае першынство ў Беларусі па публікацыйнай актыўнасці і цытаванні навукоўцаў паводле даных РІНЦ. На БДУ прыпадае каля 20% цытаванняў прац беларускіх навукоўцаў сярод усіх навуковых і адукацыйных арганізацый Беларусі. «Часопіс БДУ. Гісторыя» ўвайшоў у эліту сусветных профільных выданняў і атрымаў найвышэйшую ацэнку Q1 у рэйтынгу базы даных Scopus. Гэта прыраўноўваецца да ўваходжання ў 25% найбольш цытаванай навуковай літаратуры ў свеце. Актыўна развіваецца міжнароднае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва з вядучымі навуковымі арганізацыямі і ўніверсітэтамі розных краін. Дарэчы, у 2024 годзе ў БДУ экспарт навукаёмістых тавараў і паслуг упершыню за апошнія 10 гадоў перасягнуў мяжу ў 4 млн долараў. Важным для ўніверсітэта стала ўсталяванне ўсебаковага стратэгічнага супрацоўніцтва з Пекінскім універсітэтам, адным са значных вынікаў нашых адносін стала адкрыццё пры падтрымцы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі Беларуска-кітайскага цэнтра фундаментальных навуковых даследаванняў.

**Як Белдзяржуніверсітэт падтрымлівае маладых навукоўцаў і даследчыкаў?**

У нас захоўваецца бесперапыннасць адукацыі і навукі, і сёння ў даследчую працу залучана больш за 7300 студэнтаў. Практычна з першага курса навучання ў іх ёсць магчымасць паспрабаваць сябе ў гэтай няпростай справе. Прыкладам такой «заглыбленасці» служыць распрацоўка і стварэнне двух універсітэцкіх нанаспадарожнікаў з актыўным удзелам студэнтаў. Найбольш матываваныя праводзяць даследаванні ў лабараторыях пад кіраўніцтвам навукоўцаў БДУ. Тут навукоўцаў-пачаткоўцаў кансультуюць перад выступленнямі на ўніверсітэцкіх, рэспубліканскіх і міжнародных навуковых конкурсах, канферэнцыях і семінарах, тлумачаць ім тонкасці працы над публікацыямі і дапамагаюць аформіць дакументы на ўкараненне вынікаў даследаванняў. У мінулым годзе ўдзельнікамі 82-й навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў сталі больш за 4000 чалавек.

Напрыклад, нашы студэнты актыўна ўдзельнічаюць у штогадовым Рэспубліканскім конкурсе навуковых прац. Універсітэт – лідар у Беларусі па колькасці вылучаных грантаў маладым навукоўцам. За апошнія гады кожны трэці з іх удастоены стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, кожны чацвёрты аспірант БДУ – стыпендыят Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. БДУ – таксама лідар у падрыхтоўцы кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі. Кожная 3-я доктарская і 4-я кандыдацкая дысертацыя абараняецца работнікамі ўніверсітэта.

**Раскажыце пра ўзаемадзеянне з прадпрыемствамі краіны ў прымяненні навуковых распрацовак на практыцы. Ці ёсць міжнароднае супрацоўніцтва?**

Прывяду канкрэтныя вынікі такога ўзаемадзеяння. Нашы матэматыкі распрацавалі карпаратыўную геолага-маркшэйдарскую сістэму для суправаджэння і праектавання горных прац для прадпрыемстваў горназдабыўнога комплексу. Ветэрынарныя прэпараты, распрацаваныя ў БДУ, актыўна прымяняюцца ў сельскай гаспадарцы Беларусі і экспартуюцца за мяжу, у прыватнасці, Расію, Казахстан, Узбекістан. Шматлікія ветпрэпараты не маюць аналагаў у свеце. Дарэчы, сёння гэта шырокая лінейка інавацыйнай прадукцыі, якая выкарыстоўваецца для лячэння і прафілактыкі хвароб сельскагаспадарчых і хатніх жывёл. Прэпараты шматфункцыянальныя, дзякуючы ім змяншаецца прымяненне антыбіётыкаў у жывёлагадоўлі. Таксама можна адзначыць лінейку экалагічна бяспечных біяпрэпаратаў для абароны і стымуляцыі росту раслін «Стымул», «Бактаген», «Гулівер», «МаксІмун» і інш. Яны створаны нашымі навукоўцамі-біёлагамі. Прэпараты дазваляюць павялічыць ураджайнасць сельскагаспадарчых культур да 40%. Прадукцыя даступная ў гандлёвай сетцы краіны.

На Міжнароднай касмічнай станцыі функцыянуюць праграмна-апаратныя комплексы, распрацаваныя і выраблены ў БДУ. Сярод іх унікальны комплекс для аптычнага дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі «САВА-2-426», які не мае сусветных аналагаў.

Вялікі ўклад уносяць нашы навукова-даследчыя інстытуты, якія цесна ўзаемадзейнічаюць з рэальным сектарам эканомікі, вырашаючы навукова-тэхналагічныя задачы. Прыкладам служаць прыкладныя даследаванні ў галіне павышэння ўзроўню інфармацыйнай бяспекі нашай краіны. Нашы навукоўцы распрацавалі і ўкаранілі 20 дзяржаўных




стандартаў у галіне крыптаграфічнай абароны інфармацыі. Больш за тое, матэматыкі стварылі сістэму эканаметрычных мадэляў, якая дапамагае Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусі аналізаваць і выбіраць аптымальныя варыянты грашова-крэдытнай палітыкі.

Цяжка пераацаніць значнасць распрацоўкі экспертнай сістэмы дыягностыкі злаякасных наватвораў на аснове аналізу біяхімічных паказчыкаў крыві з прымяненнем статыстычных метадаў, якая дапамагае ўдасканальваць метады ранняй дыягностыкі ў медыцыне.

**Як плануеце ў далейшым працаваць у галіне навукі?**

Стратэгія навуковага развіцця БДУ фарміруецца на аснове сусветных трэндаў і нацыянальных прыярытэтаў Беларусі. У гарызонце наступных двух дзесяцігоддзяў ключавымі для ўніверсітэта стануць такія перспектыўныя галіны, як касмічныя сістэмы, нанаіндустрыя, біяіндустрыя, экалогія і рацыянальнае прыродакарыстанне, а таксама сацыякультурныя аспекты інтэлектуальнай эканомікі. Асноўным вектарам у сферы навукі БДУ з'яўляецца практыкаарыентаванасць навуковых даследаванняў з укараненнем вынікаў у рэальны сектар эканомікі і сацыяльную сферу.

Адмысловае значэнне для развіцця гэтых напрамкаў мае ўмацаванне міжнароднага навуковага супрацоўніцтва, дзе прыярытэтны «кітайскі» вектар. Найбольш эфектыўнай формай такой працы бачыцца стварэнне сумесных структур – даследчых цэнтраў і лабараторый. Падобныя падраздзяленні дазволяць не толькі паглыбляць фундаментальныя даследаванні, але і выводзіць навукова-тэхнічную прадукцыю на рынак Кітая, нарошчваючы экспарт высокатэхналагічных паслуг.

**Па матэрыялах БелТА**

УНІВЕРСІТЭТ
29 студзеня 2026 года, №1 (2905)

# ТРЫУМФ СТУДЭНТА БДУ: АНТЫВІРУС VINSAFE ПРЫЗНАНЫ НАЙЛЕПШАЙ РАСПРАЦОЎКАЙ ГОДА

**Інавацыі па-беларуску заваёўваюць міжнароднае прызнанне. Студэнт другога курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Аляксандр Вінакураў стаў пераможцам міжнароднага конкурсу «100 ідэй для СНД». Яго інтэлектуальная сістэма абароны дадзеных VinSafe прызнана самай лепшай распрацоўкай у намінацыі «IT-сфера».**



## УДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ НАЙЛЕПШЫЯ З ЛЕПШЫХ

Конкурс «100 ідэй для СНД» сабраў таленавітых маладых наватараў з васьмі краін. Ён праходзіў у Астане і аб'яднаў каля сотні ўдзельнікаў – студэнтаў, інжынераў і даследчыкаў, якія прапануюць арыгінальныя рашэнні для будучыні. Праект Вінакурава апынуўся ў ліку самых тэхналагічных і перспектыўных. Як сказаў сам Аляксандр, перамогі ён не чакаў:

*– Да выступлення я, вядома, не думаў, што атрымаецца заняць прызавое месца. На конкурсах такога маштабу даволі вялікая, годная канкурэнцыя. І вынік аказаўся вельмі прыемным. Таму што я бачыў, як выступалі некаторыя іншыя ўдзельнікі, якія ва ўсіх былі цікавыя праекты. Мая абарона прайшла выдатна, яна была цудоўная і ўразіла суддзяў – гэта самае галоўнае.*

Аўтарская распрацоўка Аляксандра – «VinSafe: ваша бяспека – наш клопат» – антывірусная сістэма, якая сумяшчае сучасныя метады машыннага навучання і тэхналогіі штучнага інтэлекту. Праграма выяўляе шкоднасныя файлы, прадухіляе несанкцыянаваны доступ да дадзеных і абараняе карыстальнікаў ад кібернападаў у рэжыме рэальнага часу.

Як расказаў Аляксандр, ідэя стварыць антывірусную праграмнае забеспячэнне з'явілася ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку пры падтрымцы навуковых кіраўнікоў праекта – Віктара Мальцава і Алены Белавусавай. Таксама раней студэнт працаваў у камандзе разам з Яфімам Дацэнкам.

*– Калі мы прыехалі ў тэхнапарк на сваю апошнюю змену напрамку «інфармацыйная бяспека», нам прапанавалі паспрабаваць стварыць уласны антывіруснік. Мы вырашылі з Яфімам тады працаваць у камандзе. Прымяніўшы старыя веды ў метадыцы тэсціравання антывіруснага праграмнага забеспячэння, мы вырашылі ствараць свой VinDoctor. Гэта быў першы прататып праекта VinSafe. Далей, пасля праходжання дыстанцыйнага навучання ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку, Яфім вырашыў сысці з праекта, і да гэтага часу ўжо некалькі гадоў я працягваю яго сам.*

Цяпер студэнт працуе над праектам цалкам самастойна, часам звяртаецца па параду да навуковых кіраўнікоў.

*– Хацелася б сказаць дзякуй Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту, які падтрымлівае мяне ў распрацоўцы майго праекта і дапамагае ў розных сферах,* – адзначыў Аляксандр.

Галоўнае адрозненне VinSafe ад аналагаў – здольнасць «вучыцца» на новых тыпах пагроз, хутка адаптуючыся да лічбавай прасторы, якая змяняецца пастаянна.

Праект таксама ўключае партатыўную прыладу для сканіравання знешніх носьбітаў – флэшак, дыскаў і іншых накапляльнікаў. Яна цалкам ізалявана ад асноўнага камп'ютара, што выключае рызыку заражэння. Такое рашэнне, па словах аўтара, будзе карысным як бізнесу і адукацыйным установам, так і звычайным карыстальнікам:

*– У нас ёсць цалкам ізаляваная прылада, якая можа запускаць 3 аперацыйныя сістэмы. З дапамогай гэтага можна правяраць знешнія носьбіты або любыя іншыя, а таксама праглядаць на іх файлы альбо што-небудзь з імі рабіць, як на звычайным ПК,* – дзеліцца Аляксандр.

Таксама на прыладзе стаіць адзін з алгарытмаў, які называецца «проста падазроныя файлы». Гэта файлы, якія могуць не быць вірусамі, але патэнцыйна могуць нанесці шкоду, таму што ў іх ёсць функцыі, якія вытворцы вырашылі схаваць. Напрыклад, доступ да камеры, які не быў запатрабаваны.

Распрацаваць уласны антывірус зусім не проста. Падчас працы Аляксандр сутыкнуўся з некаторымі цяжкасцямі, але змог іх пераадолець:

*– Ва ўсёй сферы інфармацыйнай бяспекі не так шмат адкрытых рэсурсаў. Менавіта таму мы былі без доступу да сакрэтнасці, і нам усё прыходзілася вывучаць самім, сваімі метадамі спроб і памылак. Спрабаваць што-небудзь знайсці, дзе-небудзь раскапаць. У астатнім асноўнымі перашкодамі былі менавіта ўласнае навучанне, павышэнне кваліфікацыі.*

Міжнароднае журы адзначыла высокі ўзровень распрацоўкі ідэі і яе практычную значнасць. Пераможцы конкурсу атрымаюць падтрымку для ўкаранення сваіх праектаў у рэальны сектар эканомікі. Але спыняцца на дасягнутым Аляксандр не збіраецца. Праграма будзе і далей развівацца:

*– У дадзены момант плануецца працяг распрацоўкі і далейшая рэалізацыя менавіта самога антывіруса. Неабходна палепшыць некалькі алгарытмаў. Я хачу давесці яго цалкам да ідэалу, каб у карыстальнікаў, якія яго купяць, не было ніводнага шанцу альбо думкі замяніць яго на іншы антывіруснік. Неабходна зрабіць так, каб яны заўсёды хацелі заставацца з вамі, і ўтрымліваць кліенцкую базу.*

## ЗАВУЧВАННЕ НЕ ВАРЫЯНТ

Сфера IT доўгі час трымае высокія пазіцыі сярод лідараў па сферах дзейнасці, але не ўсе дасягаюць вынікаў. І без пэўных фактараў вырвацца наперад немагчыма:

*– Самае галоўнае – гэта паляпшаць свае навыкі. Вы не павінны стаяць на месцы, вы павінны вывучаць новае, вучыцца. Таму што ў нас зараз ідзе такая эра, што многія людзі пайшлі ў IT і проста завучваюць тое, што ім даюць па падручніках. Вы павінны самаўдасканальвацца, развіваць сваё мысленне, каб увесь час здзіўляць сваіх працадаўцаў, каб вы маглі прадставіць тое, што не могуць іншыя. Развівацца трэба вельмі хутка, літаральна хапаць на ляту ўсю інфармацыю, якую вам даюць.*

Для Аляксандра гэта не першая перамога – вясной ён ужо стаў лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» ў намінацыі «Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі». Сёння яго поспех натхняе аднагодкаў і даказвае: талент, настойлівасць і вера ў ідэю адкрываюць шлях да вялікіх дасягненняў. А тым, хто толькі збіраецца спрабаваць сябе ў чымсьці новым, Аляксандр раіць:

*– Не здавацца і ісці да канца. Калі вы ўжо паспрабавалі прыняць удзел самі, калі вас ніхто не прымусіў, то вы павінны паказаць, што не дарма ўдзельнічаеце ў дадзеным конкурсе. Таму што кожны раз, калі вы называеце сваю школу, свой універсітэт, свой каледж, вы іх прадстаўляеце. Не забывайце пра гэта. А «100 ідэй для СНД» – гэта яшчэ адно пацвярджэнне таго, што вы ўжо многага дабіліся.*

Праект «100 ідэй для СНД» стаў працягам беларускай ініцыятывы «100 ідэй для Беларусі», якая з 2011 года дапамагае маладым даследчыкам і вынаходнікам рэалізоўваць свае ідэі. Перамогі такіх студэнтаў, як Аляксандр Вінакураў, пацвярджаюць высокі інавацыйны патэнцыял беларускай моладзі і яе гатоўнасць да глабальных выклікаў.

## ДАВЕДКА

Міжнародны моладзевы праект дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў «100 ідэй для СНД» накіраваны на развіццё інавацыйнай актыўнасці моладзі і рэалізацыю пагадненняў аб супрацоўніцтве ў сферы моладзевай палітыкі.

Рашэнне наконт яго стварэння было прынята 1 чэрвеня 2018 года Саветам кіраўнікоў урадаў СНД. Аднак вытокі праекта сыходзяць глыбей: ён вырас з паспяховага беларускага праекта «100 ідэй для Беларусі», які стартаваў у 2011 годзе, і студэнцкага фестывалю «Ёсць ідэя!», які праводзіла Міністэрства моладзі і спорту Азербайджана.

Упершыню праект «100 ідэй для СНД» прайшоў у 2014–2015 гадах у пілотным фармаце. Прэзентацыя найлепшых работ адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, дзе маладыя вынаходнікі з шасці краін прадставілі свае інавацыйныя распрацоўкі.

Назва праекта сімвалічная: на фінальным этапе ў ім удзельнічаюць каля 100 найлепшых ідэй ад маладых спецыялістаў і даследчыкаў з усіх краін СНД.

Праект рэалізуецца раз у два гады і каардынуецца Саветам па справах моладзі дзяржаў – удзельніц СНД. У 2024–2025 гадах праходзіў новы цыкл конкурсу, які аб'яднаў таленавітую моладзь да 35 гадоў з усіх краін Садружнасці.

**Таццяна САВІЦКАЯ**

# ЯЎГЕН БАБОСАЎ: «УНІВЕРСІТЭТ – ГЭТА МАЯ ЛЮБОЎ»

**Асновам акадэмічнай культуры, прафесійнаму кодэксу навукоўца і даследчыка, высокім прынцыпам выкладчыка вышэйшай школы мы вучыліся напачатку свайго навуковага шляху пад кіраўніцтвам акадэміка НАН Беларусі, доктара філасофскіх навук, прафесара Яўгена Бабосава. На сваіх лекцыях мы абавязкова паказваем студэнтам фрагменты біяграфічнага фільма пра Яўгена Міхайлавіча, тым самым працягваючы славутыя ўрокі свайго настаўніка. Мы распавядаем пра ролю акадэміка Я. М. Бабосава ў фарміраванні будучай айчыннай навуковай сацыяльна-філасофскай школы, навуковай школы сацыялогіі, пра з'яўленне сацыялогіі як дысцыпліны ва ўніверсітэцкай адукацыйнай прасторы. У гэтым і ёсць адмысловая сувязь часоў і важны момант гістарычнай памяці для маладога пакалення будучых выпускнікоў нашага ўніверсітэта, асаблівы філасофскі сімвалізм у станаўленні прафесійнай культуры сучаснага выкладчыка вышэйшай школы.**

Акадэмік НАН Беларусі Яўген Бабосаў нарадзіўся 23 лютага ў Дзень абаронцы Айчыны. Гэта знамянальная дата ў біяграфіі будучага сапраўднага баявога камсарга БДУ і маладога навукоўца – выпускніка галоўнага ўніверсітэта краіны, чыё жыццё сваім глыбокім сэнсам звязана з вялікай колькасцю навуковых лёсаў у сацыяльным пазнанні і з акадэмічнымі біяграфіямі навукоўцаў і даследчыкаў айчынных і замежных гуманітарных школ. Сапраўдны сябар і камсамольскі таварыш Я. М. Бабосава, доктар гістарычных навук, прафесар Алег Слука ў адным са сваіх нарысаў пра сувязь біяграфіі акадэміка з жыццём універсітэта аднойчы напісаў: «А можа, і быў шчаслівы выпадак у тым, што Бабосаў пачаў ствараць свой лёс у Беларускім дзяржаўным універсітэце, а яшчэ дакладней, ва ўніверсітэцкім камсамоле. Несумненна, што гэта адна са слаўных і зорных старонак яго выдатнай і аўтарытэтнай біяграфіі. Пасляваеннае пакаленне савецкай моладзі, асабліва студэнцкае, было ў пастаянным пошуку і імкненні да вяршыняў асваення сучаснага свету. Неабходна ўспомніць, што гэта памкненне было падобна ўпартасці і нават, можа быць, фанатызму. Бо ў тую пару ў грамадстве склалася ўстойлівае перакананне, што пасля пераможнай вайны наступіў час ствараць сваё заможнае жыццё і будаваць яго па-новаму. Для рэалізацыі гэтага ў грамадскай свядомасці цыркулявала магутная ідэя паходу маладых людзей па веды...»

Яўген Міхайлавіч Бабосаў дзеліцца з намі сваімі ўспамінамі пра ўніверсітэт.

**Мы спачатку хацелі б звярнуцца да вашага станаўлення, распачатага ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Распавядзіце, чаму вы абралі спецыяльнасць «філасофія»?**

Я школу скончыў з медалём. Маю ўвагу заўсёды прыцягвалі дзве дысцыпліны: руская мова і фізіка. Калі я прыйшоў паступаць у БДУ, мне, як медалісту, трэба было прайсці сумоўе. Анатоль Гусеў у той час быў прыёмным сакратаром вучонай камісіі. Ён прачытаў маю аўтабіяграфію, у якой я ўказаў, што планую паступаць на фізічны факультэт, і сказаў: «Малады чалавек, якая фізіка. Таварыш Сталін напісаў пра марксізм і пытанні мовазнаўства. Гэту працу ўсе вывучаюць. Філасофія. Вось куды трэба ісці. Падумайце і перапішыце заяву». Вось так я і паступіў на філасофію.

**Як паўплывала вучоба ва ўніверсітэце на ваша прафесійнае станаўленне?**

Я паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1950 г. Гэта быў асаблівы час. Мы ўсе былі натхнёныя нядаўняй перамогай у Айчыннай вайне, верылі ў лепшую будучыню нашай краіны. Наша студэнцкая група была вельмі здольнай, нават таленавітай. Большасць студэнтаў былі медалістамі. Амаль траціна выпускнікоў абаранілі дысертацыю. Я атрымліваў імянную стыпендыю ў БДУ. Акрамя таго, я быў членам бюро ЦК камсамола. Мы любілі ладзіць дыскусіі па розных праблемах, якія нас цікавілі і хвалявалі. Уменне дакладна і аргументавана выражаць і адстойваць сваю пазіцыю вельмі дапамагло мне ў маім прафесійным станаўленні.

**Хто з настаўнікаў аказаў найбольшы ўплыў на вас як на будучага навукоўца?**

Маім мудрым настаўнікам быў доктар філасофскіх навук, прафесар, выдатны настаўнік, удзельнік Сталінградскай бітвы Васіль Сцяпанаў. Пад яго кіраўніцтвам я ў 1961 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Дыялектыка аналізу і сінтэзу ў навуковым пазнанні». Пазней для мяне асабіста настаўнікам стаў выбітны савецкі філосаф, акадэмік, дырэктар Інстытута філасофіі АН СССР Георгій Аляксандраў.

**Якія ацэнкі вашага таленту вы лічыце найбольш каштоўнымі для сябе?**

Самыя высокія ацэнкі мне былі дадзеныя Героем Савецкага Саюза Пятром Машэравым. Мудры і патрабавальны кіраўнік, ён праяўляў клопат і ўвагу да ўсіх людзей. Досвед працы з ім быў для мяне неацэнным, а яго пахвала мела незвычайную значнасць. П. М. Машэраў аднойчы ахарактарызаваў мяне як генератара новых ідэй. І другую запамінальную ацэнку ён мне даў у тэатры, калі сказаў маёй жонцы: «Ваш муж – таленавіты чалавек. Яго трэба берагчы».

**Вы выкладалі ва ўніверсітэце на працягу шматлікіх гадоў. Як вы ацэньваеце сучасных студэнтаў? Наколькі змяніліся каштоўнасці і прыярытэты студэнцтва?**

Сучасныя студэнты як быццам бы больш начытаныя. Яны атрымліваюць мноства інфармацыі з інтэрнэту, усё ведаюць, але не спрабуюць глыбока пракрасціся ў сутнасць пытання. У мінулым літаратуры было менш. Я памятаю, як мы хадзілі ў бібліятэку, у якой была толькі адна кніга па дыялектычным матэрыялізме. Для таго, каб яе прачытаць, мы з аднакурснікам удваіх з самай раніцы на абмежаваны час яе бралі. А потым гэту кнігу ўжо чыталі іншыя студэнты. Нам складана было знайсці многія цікавыя выданні. Аднак узровень разумення праблемы быў вышэйшы.

**Вы з'яўляецеся аўтарам мноства падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. Якія выданні вы можаце адзначыць?**

Я напісаў падручнікі «Сацыялогія», «Канфліктaлогія», «Паліталогія», «Культуралогія», «Асновы ідэалогіі сучаснай дзяржавы», «Рэлігіязнаўства» і шэраг іншых дапаможнікаў. Яны неаднаразова перавыдаваліся. Так, напрыклад, падручнік «Сацыялогія кіравання» быў выдадзены 6 разоў, і колькасць экзэмпляраў кожнага выдання складала 2000. Навучальна-метадычны дапаможнік «Сацыялогія канфліктаў» быў апублікаваны ў рамках серыі «Класічнае ўніверсітэцкае выданне», што сведчыць пра яго высокі ўзровень.

**Чым з'яўляецца для вас Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт?**

Універсітэт для мяне – гэта мая любоў, мая мара, мой родны дом. Я з шанаваннем стаўлюся да ўсяго, што з ім звязана. Можна сказаць, што я не ўяўляю свайго жыцця без майго ўніверсітэта. Напэўна, мой лёс быў бы іншы, калі б маё жыццё не было так цесна з ім пераплецена. Я любіў універсітэт і люблю цяпер. І цяпер я сюды прыходжу і бачу іншы корпус і іншых людзей, паколькі тых, хто раней тут быў, ужо, напэўна, нікога няма. Таму я адчуваю, што, калі я ва ўніверсітэце, сэрца маё пачынае біцца часцей. Я вяртаюся быццам бы з далёкай паездкі дахаты.

**Якія пажаданні і рэкамендацыі вы маглі б даць цяперашнім студэнтам?**

Па-першае, заўсёды ў любой сітуацыі і з любым чалавекам, няхай гэта будзе настаўнік, таварыш, муж, міліцыянер, які спыніў на скрыжаванні, прахожы ці падарожны, заставацца самім сабой, не змяняць сябе як хамелеон. У любым дзеянні, калі ты штосьці пішаш ці гаворыш, смяешся ці танчыш, павінна выяўляцца твая ўнікальнасць.

Па-другое, заўсёды ставіць перад сабой складаную задачу, якая на першы погляд здаецца невыканальнай. Калі яе пачаць рэалізоўваць, можна заўважыць, што яна трохі пачынае паддавацца. І тады можна выканаць больш складаную задачу, чым ты планаваў раней. Тым самым ты адкрываеш сабе шлях да новых магчымасцяў.

Па-трэцяе, ніколі нікому ні ў чым не зайздросціць. У кожнага свой жыццёвы лёс, сваё наканаванне, якое запраграмавана. Не здраджваючы лёсу, мы не здраджваем самім сабе.

Па-чацвёртае, ёсць такі выраз: чалавек створаны для шчасця, як птушка для палёту. Шчасце – гэта найвышэйшае напружанне творчых сіл чалавека. Людзі з'яўляюцца творцамі свайго шчасця. Чалавек нясе ў сабе свой уласны ўнутраны свет, які сам стварае. У тым выпадку, калі чалавек дасягнуў сваёй мэты ў любові, спорце, палітыцы, ён шчаслівы. Здрадзіць свайму шчасцю нельга, бо інакш яно ператворыцца ў няшчасце. Для мяне быць шчаслівым – гэта жыць і працаваць ва ўлюбёным горадзе, мець адданых сяброў, якія заўсёды прыйдуць да цябе на дапамогу, пакахаць дзяўчыну, якая ўзрушыла тваё ўяўленне і сэрца і засталася адзінай каханай на ўсё жыццё, дамагчыся поспеху ў прафесійнай сферы.

Па-пятае, заставацца шчырым перад самім сабой у ацэнцы сваіх поспехаў і няўдач. Трэба імкнуцца жыць сумленна, быць міласэрным, клапаціцца пра тых, хто знаходзіцца побач. І памятайце: якой бы цяжкай ні была сітуацыя, варта захоўваць аптымізм і веру ў лепшую будучыню.



Біяграфія акадэміка непасрэдна стварыла ў айчынным сацыяльным пазнанні навуковы час для наступнага пакалення навукоўцаў, якое выказвае сёння любоў і бясконцую падзяку свайму незвычайнаму настаўніку – Яўгену Бабосаву.

**Юлія Банькоўская,
прафесар кафедры культуралогіі ФСК БДУ,
Марыя Валністая, дацэнт кафедры
сацыялогіі ФФСН БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 студзеня 2026 года, №1 (2905)

# НАВУКОЎЦЫ БДУ СТАЛІ ЎЛАДАЛЬНІКАМІ ГРАНТАЎ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ НА 2026 ГОД

**Яны лечаць хваробы, ствараюць тэхналогіі і задаюць культурны код нацыі. 42 беларускія спецыялісты – ад навукоўцаў да дзеячаў культуры – сталі ўладальнікамі прэзідэнцкіх грантаў на 2026 год. Сярод пераможцаў даследчыкі БДУ, гатовыя пераўтвараць дзяржаўную падтрымку ў навуковыя адкрыцці, адукацыйныя інавацыі і сацыяльныя праекты, важныя для ўсёй краіны.**



Фінансаванне для праекта ў галіне навукі вылучана старшаму навуковаму супрацоўніку лабараторыі спектраскапіі НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі **Дзмітрыю Тарасаву**.

Шлях у навуку Дзмітрый распачаў яшчэ ў школе. Цікавасць да вырашэння складаных матэматычных задач у пятым класе і поспехі на алімпіядах з часам перараслі ў захапленне фізікай, што і вызначыла выбар прафесіі. Пасля дзявятага класа ён прыняў рашэнне паступаць на фізічны факультэт БДУ на спецыяльнасць «фізік-даследчык».

Навукоўца найбольш натхняе працэс вывучэння новага і пераўтварэння нявызначанасці ў канкрэтны вынік. Ён падкрэслівае, што колькасць нявырашаных задач толькі расце, і гэта робіць навуку пастаянным выклікам для новых ідэй.

Грантавая падтрымка будзе накіравана на распрацоўку канцэптуальных асноў для аналізу законаў згасання флуарэсцэнцыі ў шматкампанентных сістэмах. Вынікі гэтай працы дазволяць укараніць навукова абгрунтаваную метадалогію апрацоўкі дадзеных у практыку медыка-біялагічных даследаванняў.

*– Многія знаёмыя з люмінесцэнцыяй – з гэтай з'явай мы сустракаемся ў лямпах дзённага святла, на цыферблатах, у паўночным зззянні і нават у святле марскога планктону. У навуцы спектраскапія люмінесцэнтнага свячэння – магутны аналітычны інструмент. Вымяраючы, як хутка яно згасае (флуарэсцыруе), навукоўцы могуць вывучаць структуру бялкоў, механізмы алергічных рэакцый і іншыя тонкія працэсы ў жывых сістэмах. Для гэтых вымярэнняў шырока выкарыстоўваецца высокадакладны метад – час-карэляваны падлік фатонаў (TCSPC),* – адзначае Дзмітрый Тарасаў.

*– Аднак ключавая праблема сёння не ў саміх вымярэннях, а ў іх інтэрпрэтацыі,* – тлумачыць навуковец. *– Алгарытмы апрацоўкі дадзеных часта ідэальна працуюць на мадэльных прыкладах, але даюць супярэчлівыя вынікі з рэальнымі, складанымі ўзорамі, што робіць аналіз заблытаным і суб'ектыўным.*

Навізна падыходу даследчыка БДУ заключаецца не ў стварэнні новага метаду, а ў распрацоўцы эталоннай метадалогіі для інструмента, які ўжо стаў стандартам.

*– Мая ідэя заключаецца ў выкарыстанні назапашанага вопыту для распрацоўкі метадычных рэкамендацый для аналізу вымеранай паводле метаду TCSPC кінетыкі згасання флуарэсцэнцыі, якое забяспечыць аб'ектыўнае і карэктнае вызначэнне кінетычных характарыстык флуарэсцэнцыі складаных шматкампанентных малекулярных сістэм. У сваёй распрацоўцы я арыентуюся на паляпшэнне выкарыстання на практыцы фактычна стандартнага метаду – нелінейнага метаду найменшых квадратаў.*

Праца вядзецца ў камандзе, якая аб'ядноўвае спецыялістаў лабараторыі – фізікаў, хімікаў, інжынераў. Праект таксама падтрымліваецца шырокай калабарацыяй з калегамі з іншых лабараторый і навуковых арганізацый.

Сур'ёзным выклікам Дзмітрый бачыць пошук балансу паміж эфектыўнасцю рашэння і патрэбнымі для гэтага намаганнямі. А прэзідэнцкі грант – важны інструмент для такіх кароткатэрміновых праектаў.

*– У першую чаргу гэта велізарная магчымасць і рэсурс для рэалізацыі задуманай задачы, карысная для навуковай супольнасці. Таксама гэта пацвярджэнне значнасці працы на высокім узроўні, што дае імпульс для далейшага развіцця,* – дзеліцца Дзмітрый.

Акрамя фінансавання, галоўнай умовай поспеху праекта навуковец бачыць наяўнасць каманды з дастатковымі кампетэнцыямі для вырашэння пастаўленых задач. А асабістай асноўнай матывацыяй у складанай працы для даследчыка застаюцца прага пазнання, цікаўнасць і задавальненне ад разумення будовы тых ці іншых працэсаў, а таксама магчымасць стварэння новых сістэм.

Маладым калегам, якія толькі пачынаюць даследчы шлях, Дзмітрый Тарасаў раіць актыўна вучыцца, бо гэта пастаяннае развіццё. Ён падкрэслівае важнасць пошуку добрага настаўніка, у якога можна пераняць не толькі тэарэтычныя веды і практычныя навыкі, але і падыходы да арганізацыі дзейнасці, вырашэння праблем і кіравання праектамі. Ключавым момантам ён лічыць выбар тэмы, якая павінна спалучаць цікавасць, перспектыўнасць і рэалізаванасць у даступныя тэрміны з наяўнымі рэсурсамі.



Гранта Прэзідэнта ў галіне адукацыі ўдастоена старшы выкладчык кафедры агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі біялагічнага факультэта БДУ **Софія Левыкіна**. Фінансаванне будзе накіравана на стварэнне і ўкараненне інавацыйнага электроннага навучальна-метадычнага комплексу па дысцыпліне «Узаемадзеянне геномаў».

Комплекс будзе ўключаць аўтарскі алгарытм прымянення найноўшых метадаў біяінфарматыкі з выкарыстаннем тэхналогіі докер-кантэйнераў для зборкі і аналізу бактэрыяльных геномаў. Гэты праект адпавядае сучаснаму айчыннаму і сусветнаму ўзроўню вышэйшай адукацыі.

Пра свой шлях у навуку Софія гаворыць проста: прыйшла ва ўніверсітэт, як і большасць студэнтаў, вывучаючы навуковых кіраўнікоў і выбіраючы напрамак, блізкі да яе інтарэсаў.

*– Самае захапляльнае для мяне ў навуцы – даведвацца штосьці новае ў цэлым і адказваць на пытанне: а як гэта адбываецца ў майго аб'екта даследавання? Параўноўваць заўсёды цікава,* – дзеліцца яна.

Электронны комплекс стане часткай праграмы для новай спецыяльнасці «біяінжынерыя і біяінфарматыка» на біялагічным факультэце БДУ. Па словах Софіі Левыкінай, гэта дазволіць студэнтам асвойваць больш шырокі спектр методык працы з геномнымі дадзенымі.

*– Біяінфарматычнае праграмнае забеспячэнне, створанае ў нашай СНДЛ біяінфарматыкі і малекулярнай эвалюцыі жывёл, дазволіць прапусціць шэраг працаёмкіх этапаў, якія звычайна займаюць у студэнтаў шмат гадзін. Нашая распрацоўка аўтаматызуе гэтыя працэсы, даючы магчымасць адразу пераходзіць да больш глыбокага аналізу геномных дадзеных. Гэта пашырыць іх метадалагічны арсенал,* – адзначае выкладчык.

Таксама важнай задачай яна лічыць навучанне студэнтаў самастойнаму праграмаванню аналагічнага ПА.

*– У рамках праграмы я б хацела навучыць іх ствараць падобныя інструменты самім. Гэтыя навыкі дазволяць будучым біяінфарматыкам адаптавацца да канкрэтных задач і сітуацый у працы,* – дадае Софія Левыкіна.

Навуковую дзейнасць Софія вядзе ў складзе СНДЛ біяінфарматыкі і малекулярнай эвалюцыі жывёл. Лабараторыя аб'ядноўвае выкладчыкаў і захопленых навукай студэнтаў, многія з якіх атрымліваюць гранты на свае даследаванні пры актыўнай падтрымцы старэйшых калегаў. Яркім прыкладам поспеху такога настаўніцтва стала студэнтка Софіі, удастоеная ў 2025 годзе звання «Найлепшы выпускнік БДУ» і дыплома першай катэгорыі на Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ, а цяпер яна працягвае навукова-педагагічную кар'еру ў магістратуры.

Галоўным прафесійным выклікам выкладчыца лічыць кіраванне часам – здольнасць выканаць задуманае ў поўным аб'ёме і ў тэрмін. Прысуджэнне прэзідэнцкага гранта яна расцэньвае як сігнал прызнання і падтрымкі.

*– Гэта дэманструе, што я іду правільнай дарогай і што мае ідэі таксама каштоўныя для дзяржавы, як і для мяне,* – кажа яна.

Такая форма падтрымкі, на яе думку, вельмі важная для праектаў, якія патрабуюць значных асабістых намаганняў. Акрамя фінансавання, ключавымі ўмовамі поспеху праекта яна называе шчырую захопленасць сваёй справай і згуртаваную каманду.

*– Жаданне працаваць з любові і павагі да сферы, у якой рэалізоўваешся. І, вядома, надзейны калектыў, які падзяляе твае каштоўнасці,* – тлумачыць Софія.

Асноўнай асабістай матывацыяй для маладога выкладчыка з'яўляецца магчымасць унесці ўклад у сферу адукацыі і пакінуць у ёй свой след, што, па яе прызнанні, невераагодна натхняе і дае сіл для далейшай працы. І раіць маладым калегам быць гатовымі эксперыментаваць:

*– Спрабаваць. У кожнай сітуацыі, у якой узнікае сумненне, спрабаваць. Не атрымаецца тут – атрымаецца з іншай ідэяй!*



Грант Прэзідэнта таксама атрымаў загадчык кафедры вышэйшай алгебры і аховы інфармацыі механіка-матэматычнага факультэта БДУ **Сяргей Ціханаў**. Фінансаванне будзе накіравана на развіццё новых метадаў даследавання асацыятыўных алгебраў і алгебраічных груп для знаходжання роду канечнамерных алгебраў.

Свой шлях у матэматыку Сяргей Ціханаў пачаў яшчэ ў дзяцінстве, аддаўшы перавагу прыродазнаўчым навукам. Пазней гэтая цікавасць была звужана да матэматыкі – ён паступіў у матэматычны клас Ліцэя БДУ, а затым – на механіка-матэматычны факультэт універсітэта.

*– Падчас вучобы на выбар маёй будучай спецыялізацыі аказалі вялікі ўплыў акадэмік В. І. Янчэўскі, прафесары А. С. Рапінчук і В. І. Чарнавусаў. Пачынаючы з першага курса,*

*яны праводзілі дадатковыя семінары па вышэйшай алгебры,* – успамінае навуковец.

Пасля заканчэння факультэта яго кар'ера працягнулася ў Інстытуце матэматыкі НАН Беларусі, дзе з 1996 па 2013 год ён прайшоў шлях ад стажора-даследчыка да вядучага навуковага супрацоўніка. У 1999 годзе пад кіраўніцтвам В. І. Янчэўскага Сяргей Ціханаў абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў 2008 годзе сумесна з І. Д. Супруненка і В. І. Янчэўскім быў удастоены прэміі НАН Беларусі. З 2010 года ён пачаў працаваць па сумяшчальніцтве, а з 2013 года – штатна на кафедры вышэйшай алгебры і аховы інфармацыі роднага факультэта.

*– Так склалася, што навука – неад'емная частка майго жыцця. Самае захапляльнае ў навуцы – працэс пастаяннага адкрыцця новага, вырашэнне складаных задач,* – кажа Сяргей Ціханаў.

Ён таксама адзначае, што матэматыка падаравала яму магчымасць убачыць свет. Навуковец удзельнічаў у міжнародных матэматычных кангрэсах у Кітаі, Індыі, Паўднёвай Карэі, Бразіліі і на канферэнцыях, дзе ён знаёміўся з вядомымі навукоўцамі.

Сяргей Ціханаў тлумачыць сутнасць сваёй распрацоўкі праз алгебраічныя структуры.

*– Я займаюся даследаваннем канечнамерных асацыятыўных алгебраў, якія можна разглядаць як абагульненне мноства цэлых лікаў са складаннем і множаннем. Гэтыя алгебры ўключаюць у сябе элементы, якія таксама можна складаць і памнажаць.*

Навізна заключаецца ў развіцці метадаў даследавання такіх алгебраў і алгебраічных груп для знаходжання іх «роду». Гэта фундаментальная праца, якая можа пашырыць прымяненне канечнамерных асацыятыўных алгебраў у крыптаграфіі.

*– Сучасная крыптаграфія, асабліва асіметрычная, у значнай ступені грунтуецца на ідэях з алгебры і тэорыі лікаў,* – тлумачыць навуковец.

Карыснасць распрацоўкі можа праявіцца з часам, як гэта адбылося з абстрактнай тэорыяй груп XIX стагоддзя, якая цяпер шырока выкарыстоўваецца ў ахове інфармацыі.

*– Матэматыка прасякае ўсе сучасныя тэхналогіі,* – робіць выснову Сяргей Ціханаў.

Над праектам ён працуе ў звязцы з замежнымі калегамі, а таксама кіруе магістрантамі і аспірантамі.

Сур'ёзным доўгатэрміновым выклікам ён лічыць задачу прыцягнення моладзі ў навуку і павышэнне прэстыжу прафесіі навукоўца.

*– Я выказваю глыбокую ўдзячнасць за дзяржаўную падтрымку фундаментальных даследаванняў у галіне матэматыкі, за прызнанне дасягненняў нашай беларускай алгебраічнай школы,* – кажа Сяргей Ціханаў. *– Гэтая падтрымка прывядзе ў нашу сферу таленавітую моладзь, за якой будучыня навукі.*

Для яго грант і прызнанне на дзяржаўным узроўні надаюць дзейнасці дадатковы сэнс і стымулююць да далейшай працы.

Фундаментальная матэматыка не патрабуе дарагога абсталявання ці матэрыялаў, асноўныя выдаткі звязаны з кадрамі.

*– Поспех праекта залежыць ад наяўнасці захопленых людзей, гатовых паглыбляцца ў задачы,* – адзначае навуковец.

Галоўнай асабістай матывацыяй для яго з'яўляецца задавальненне ад пераадолення цяжкасцяў, усведамленне свайго ўкладу ў навуку і пастаянны працэс пазнання.

*– Дасягненне высокіх навуковых вынікаў апраўдвае ўсе спадарожныя цяжкасці,* – сцвярджае Сяргей Ціханаў.

А маладым даследчыкам ён раіць быць настойлівымі і мэтанакіраванымі, а таксама пераймаць вопыт старэйшых калегаў.



Грант Прэзідэнта таксама атрымаў загадчык кафедры глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ **Аляксандр Чэрвань**. Фінансаванне накіравана на стварэнне сучаснага электроннага навучальна-метадычнага комплексу па дысцыплінах «ГІС-аналіз і картаграфаванне глеб» і «Глебавае ГІС-картаграфаванне».

Свой шлях у навуку Аляксандр называе ў значнай ступені фармальным і выпадковым. Скончыўшы ў 2006 годзе спецыяльнасць «геаінфармацыйныя сістэмы» на той самай кафедры, якую ён узначальвае сёння, ён вырашыў паступаць у аспірантуру.

*– ГІС-тэхналогіі, з аднаго боку, як універсальны інструмент у розных галінах ведаў, палягчалі задачу працягу навучання, з другога – ускладнялі яе ў сувязі з неабходнасцю выбару вузкага навуковага напрамку свайго прымянення,* – успамінае ён.

Вырашальнай стала рэкамендацыя намесніка дырэктара НДІ А. Ф. Чарныша, – ён параіў узяць навуковым кіраўніком галоўнага глебазнаўцу краіны, прафесара Т. А. Раманаву.

*– З першага дыялогу з настаўнікам я зразумеў, што трапіў у сферу, дзе магу прымяніць свае веды і ГІС-навыкі на фундаментальнай навуковай аснове,* – успамінае навуковец пра прафесара Раманаву, прадстаўніцу класічнай навукі.

Галоўная ідэя электроннага навучальна-метадычнага комплексу «ГІС-аналіз і картаграфаванне глеб» складаецца ў самастойнай паглыбленай працы студэнтаў па дысцыплінах глебазнаўча-геаінфармацыйнай тэматыкі з выкарыстаннем дыстанцыйнага доступу да дадзеных.

*– З улікам вынікаў маёй навуковай дзейнасці ўпершыню будзе распрацаваны шэраг відэалекцый, тэставыя заданні ў галіне геаінфармацыйнага мадэлявання глебавага покрыва і кейсы індывідуальных праектаў студэнтаў у праграмным ГІС-асяроддзі, якія маюць розныя сцэнарыі рашэнняў,* – кажа навуковец. *– Гэта будзе спрыяць развіццю ў будучых спецыялістаў прасторавага і сістэмнага мыслення. Частка матэрыялаў будзе прадстаўлена на англійскай мове для замежных студэнтаў.*

Карыснасць комплексу – практычная. Ён дасць студэнтам навыкі паглыбленай апрацоўкі глебавых дадзеных у ГІС-асяроддзі. Гэтыя навыкі – аснова для дзяржаўнай ацэнкі зямель, іх маніторынгу і вядзення кадастра. Гэта значыць, праект рыхтуе кадры для кіравання зямельнымі рэсурсамі краіны.

Над комплексам Аляксандр працуе сам, абапіраючыся на свае распрацоўкі. Частку задач выконвае з дапамогай калегаў. Таксама ён атрымлівае метадычныя кансультацыі ад калектыву сваёй кафедры. Галоўны выклік у гэтай працы ён бачыць у тыповай для навукоўца і кіраўніка нястачы часу.

*– Некаторыя цяжкасці могуць быць выкліканы адсутнасцю восьмага дня ў тыдзень або хаця б 25-й гадзіны ў сутках, але гэта ўжо дастаткова звыклая справа,* – з гумарам адзначае Аляксандр Чэрвань.

Сур'ёзных метадычных цяжкасцяў у praktыцы ён не бачыць. Прэзідэнцкі грант, на яго думку, важны, бо праект адпавядае дзяржаўнай палітыцы эфектыўнага выкарыстання зямельных рэсурсаў. Распрацоўка дасць спецыялістам ключавыя навыкі працы з прасторавымі дадзенымі для маніторынгу і ўліку глеб.

*– Як і ў 2015 годзе, калі я стаў стыпендыятам фонду Прэзідэнта, цяпер атрыманне гранта азначае для мяне цесную сувязь паміж навукай і адукацыяй, якая падтрымліваецца ў нашай краіне на самым высокім узроўні,* – кажа ён.

Такую палітыку ён лічыць эфектыўнай, бо станаўленне высакакласнага спецыяліста патрабуе развіцця ў двух напрамках: акрамя фінансавання, галоўнай умовай поспеху праекта ён бачыць зладжаную каманднае працу, дзе кожны ўдзельнік разумее сваю ролю і значнасць у агульнай справе.

Асабістай галоўнай матывацыяй у навуцы для яго з'яўляецца магчымасць самастойна ствараць цікавыя ўмовы ўласнага жыцця. А ў рамках гэтага праекта ім рухае жаданне ўдасканальваць падрыхтоўку студэнтаў у актуальнай навукова-вытворчай галіне.

Маладым калегам Аляксандр Чэрвань раіць з самага пачатку адказна падысці да выбару фундаментальнага навуковага напрамку, у якім яны змогуць у будучыні распрацоўваць уласныя ідэі.

**Таццяна САВІЦКАЯ**

## НАВІНЫ МІНСКА | БЕЛАРУСІ

Трэцяя рэспубліканская канферэнцыя навучэнцаў «Першы крок у навуку» сабрала ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі каля 500 старшакласнікаў. Мерапрыемства накіраванае на выяўленне маладых даследчыкаў і развіццё іх навыкаў прэзентацыі навуковых прац. Яго мэта – пазнаёміць школьнікаў з сучаснымі дасягненнямі беларускай навукі. Арганізатарам канферэнцыі выступіў савет маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У рамках дзяржаўнай праграмы «Культурная прастора» на 2026–2030 гады ў Мінску запланаваная рэстаўрацыя шэрагу гісторыка-культурных аб'ектаў. Сярод ключавых – комплекс Нацыянальнага мастацкага музея, Пішчалаўскі замак, Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс і Чырвоны касцёл. Фінансаванне работ будзе ажыццяўляцца з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

Беларускія сеткі 3G і LTE дасягнулі амаль поўнага пакрыцця тэрыторыі і насельніцтва. Для павелічэння магутнасці сетак і вырашэння праблемы перагрузак пачалося ўкараненне тэхналогіі 5G. Новая тэхналогія, якая выкарыстоўвае шырэйшыя каналы, пачне ўкараняцца ў гарадах і значна павялічыць ёмістасць сетак. Гэта дазволіць разгрузіць састарэлыя сеткі 3G, бо большасць карыстальнікаў пяройдзе на тэхналогіі 4G і 5G.

Праект чацвёртай, кальцавой, лініі Мінскага метрапалітэна абноўлены, цяпер у ім прадугледжана 15 станцый. Лінія злучыць тры існыя веткі метро, і шэсць яе станцый стануць перасадачнымі. Яе асноўная траса будзе пракладзена пад Другім транспартным кальцом. Запуск гэтай лініі дапаможа размеркаваць пасажырапаток і разгрузіць цэнтральныя перасадачныя вузлы.

У Мінску скончылася першая інжынерная змена для навучэнцаў 10-х класаў, якая праходзіла на базе Цэнтра тэхнічнай творчасці. На працягу тыдня школьнікі працавалі ў трох лабараторыях: IT-тэхналогій, суднамадэлявання і архітэктуры, дзе стваралі ўласныя праекты. Мэтай інтэнсіву была паглыбленая прафесійная арыентацыя і развіццё практычных навыкаў у сучасных тэхналогіях. Свае распрацоўкі паспяхова абаранілі 38 удзельнікаў гэтай змены.

У Мінску на тэрыторыі САК «Алімпійскі» ўрачыста адкрыўся ўнікальны для Беларусі цэнтр пляжных відаў спорту «Пясчаная дзюна». Кіраўнік НАК Віктар Лукашэнка адзначыў, што гэты аб'ект стане домам для зборных каманд па пляжным футболе і валейболе, даўшы новы імпульс развіццю гэтых відаў спорту. Цэнтр быў пабудаваны ў рэкордныя тэрміны – за 18 месяцаў, і яго адкрыццё адбылося неўзабаве пасля выхаду беларускай зборнай па пляжным футболе ў фінал чэмпіянату свету. У дзень адкрыцця на новай пляцоўцы прайшоў першы матч, у якім нацыянальная зборная атрымала перамогу над сталічным клубам «Мінск».

У 2026 годзе ў Мінску плануецца капітальна адрамантаваць 141 жылы дом агульнай плошчай 780 тысяч квадратных метраў. Сярод іх – дзесяць аб'ектаў, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнай спадчынай. Рамонтныя работы праводзяцца ў рамках перспектыўных праграм на 2026–2030 гады. Асноўная ўвага надаецца чатырох- і пяціпавярховым будынкам 1970-х гадоў, а таксама шматпавярховым дамам 1980-х гадоў пабудовы.

Пасля спаду ў лістападзе рынак нерухомасці Мінска ў снежні паказаў рост актыўнасці: колькасць здзелак з кватэрамі павялічылася на 6,7%, дасягнуўшы 1221. Сярэдняя цана квадратнага метра працягнула рост, склаўшы 1972 долары, што на 0,5% вышэй, чым у лістападзе. Попыт заставаўся стабільным, пры гэтым 47% усіх здзелак прыйшлося на аднапакаёвыя кватэры, хоць іх сярэдняя цана нязначна знізілася. Самай дарагой здзелкай месяца стаў продаж кватэры ў ЖК «ДЭПО» па цане 4567 долараў за квадратны метр.

«Беларусбанк» запусціў абноўлены афіцыйны сайт, аптымізаваны перш за ўсё для мабільных прылад, з якіх заходзіць 70% аўдыторыі. Ключавымі паляпшэннямі сталі спрошчаная навігацыя і інструмент для інтэрактыўнага параўнання прадуктаў, што паскарае выбар кліентаў. Новы рэсурс прайшоў атэстацыю сістэмы абароны інфармацыі, якая пацвярджае надзейнасць захоўвання персанальных дадзеных.

УНІВЕРСІТЭТ
29 студзеня 2026 года, №1 (2905)

# ВОЛЬГА МАХНАЧ: «ПРАЦАВАЦЬ З ТАЛЕНАВІТЫМІ ЛЮДЗЬМІ ЗАЎСЁДЫ ЦІКАВА»





**У межах праекта «Размовы пра культуру і творчасць» рады прадставіць наступнага ўдзельніка – народны фальклорны ансамбль «Сарматы» БДУ. Ужо больш за 30 гадоў калектыў займаецца адраджэннем беларускіх народных песень і іх папулярызацыяй у новай музычнай апрацоўцы і сучасным гучанні. Пра ўнікальнасць ансамбля і творчую дзейнасць расказала мастацкі кіраўнік Вольга Махнач.**

Я нарадзілася ў 1977 г. Удзельнічала ў ансамблі з дзяцінства. У 1996 годзе скончыла Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў, у 2001 г. – Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі. У тым жа годзе пачала працу ў ансамблі ў якасці кіраўніка аркестравай групы. З 2015 г. – кіраўнік калектыву.

**Як пачалася гісторыя ансамбля?**
Народны фальклорны ансамбль Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта «Сарматы» (раней – «Тутэйшая шляхта») быў заснаваны ў 1992 годзе маім бацькам – кандыдатам хімічных навук, які адначасова з'яўляецца таленавітым музыкантам-аматарам і аўтарам дэбютных праграм ансамбля – Леанідам Махначом. Калектыў складаўся першапачаткова з выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Гэта было цікавае і разнастайнае аб'яднанне творчых людзей, якія шанавалі беларускую культуру і мову. З цягам часу ансамбль мяняўся, пашыраўся рэпертуар, павялічвалася колькасць канцэртаў і выступленняў.

**Як вы сталі кіраўніком ансамбля?**
Я была ўдзельніцай гэтага праекта з першых дзён. У той час яшчэ школьніцай я іграла на цымбалах. Атрымаўшы адукацыю, пачала кіраваць аркестравай групай ансамбля.

**Хто можа стаць удзельнікам ансамбля «Сарматы»?**
Ансамбль складаецца са студэнтаў, супрацоўнікаў і выпускнікоў нашай навучальнай установы, якія маюць неабходныя здольнасці, навыкі і якім даспадобы гучанне і непаўторны стыль нашага гурта.

**З якіх нумароў складаецца рэпертуар?**
Рэпертуар вельмі шырокі – ад музыкі, папулярнай у колах шляхты ВКЛ, прыкладна з XVI ст., і да аўтарскіх твораў у стылі фолк-рок, мы яго акрэслілі як «сармацкі рок». Ёсць таксама беларускія народныя песні ва ўласнай апрацоўцы.



**У якім фармаце праходзяць рэпетыцыі?**
Фармат нашых рэпетыцый можа быць розны і залежыць ад мэты, якая стаіць перад намі. Ён уключае і агульныя рэпетыцыі-прагоны канцэртнай праграмы на сцэне ў канцэртных строях, і развучванне новых песень у малых групах, і індывідуальныя заняткі. Рэпетыцыі заўсёды вельмі насычаныя і актыўныя, бо часу звычайна не хапае.

**Якія ўнікальныя музычныя інструменты выкарыстоўваюцца падчас выступленняў?**
Інструментальны склад можа змяняцца ад класічнай гітары і акустычнай бас-гітары да бас-гітары, ударнай устаноўкі і электрагітары з працэсарам, неабходнымі для выканання музыкі ў стылі фолк-рок. Акрамя таго, у нас гучаць скрыпка, цымбалы, народныя і класічныя духавыя інструменты (дудкі, акарыны, дуды, флейта, труба). І, зразумела, вакал. Спяваем шматгалосна. Наша вакальная група ўяўляе сабой ансамбль салістаў. Кожны выконвае сваю асобную партыю, таму і патрабаванні да нашых выканаўцаў (як вакалістаў, так і інструменталістаў) вельмі сур'ёзныя.

**Падзяліцеся, калі ласка, самым яскравым успамінам, звязаным з ансамблем.**
Для мяне гэта і рэпетыцыі, і канцэрты, і выступленні. Кожнае ўзаемадзеянне з калектывам – гэта няспынны творчы працэс, які застаецца ў памяці і натхняе яшчэ доўгі час.



**Якім дасягненнем гурта вы ганарыцеся найбольш?**
Падчас рэалізацыі кожнага канцэрта ўзнікаюць пэўныя тэхнічныя складанасці, і, калі атрымліваецца рэалізаваць усё, што было запланавана, гэта выклікае пачуццё задавальнення і жаданне рухацца далей. Ансамбль мае вялікую колькасць студыйных запісаў, чым мы таксама ганарымся. Некаторыя творы з'яўляюцца музычнымі помнікамі беларускай культуры, як, напрыклад, раманс «Дзеванька», напісаны Антонам Абрамовічам на словы Яна Баршчэўскага ў першай палове XIX ст. на беларускай мове. Мы зрабілі яго студыйны запіс. Таксама гэта шматлікія творы з «Полацкага сшытка» XVII ст., гімн «Багародзіца» (у розных крыніцах падаецца час напісання ад XIII ст.) і інш.

**У чым унікальнасць «Сарматаў»?**
Мы прыкладваем усе намаганні, каб кожны наш канцэрт стаў яркім эмацыйным перажываннем. Працаваць з таленавітымі людзьмі заўсёды цікава і ганарова. Большасць удзельнікаў прыходзяць да нас з пачатковымі музычнымі ведамі альбо зусім без іх. Калі назіраеш, як развіваюцца творчыя здольнасці нашых студэнтаў, гэта вельмі натхняе.

**Што б вы хацелі пажадаць усім, хто займаецца творчай дзейнасцю?**
Хачу пажадаць ім натхнення, таленавітых людзей побач і шырокіх магчымасцяў для рэалізацыі планаў.

## ДАВЕДКА

Народны фальклорны ансамбль «Сарматы» БДУ – гэта:
- 34 гады творчай дзейнасці
- Рэгулярныя канцэрты, выступленні і гастролі
- Папулярызацыя беларускіх народных песень
- Званне «Народны» ў 2000 г.
- Ганаровы медаль і падзяка ад Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў 2025 г.

**Музей гісторыі БДУ,**
**упраўленне па справах культуры БДУ**

# ДЗЕНЬ АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ: ПЕРШЫ КРОК ДА СВЯДОМАГА ВЫБАРУ

**Дні адчыненых дзвярэй у БДУ – гэта магчымасць убачыць універсітэт знутры і зразумець, ці падыходзіць табе гэты шлях. Яны праходзяць у фармаце сустрэч, прэзентацый, майстар-класаў і нефармальных зносін. Абітурыенты могуць пазнаёміцца з факультэтамі і спецыяльнасцямі, задаць пытанні выкладчыкам, студэнтам і прадстаўнікам прыёмных камісій, даведацца пра асаблівасці ўступных экзаменаў, навучальнага працэсу і жыцця па-за вучобай. Такі фармат дазваляе не проста атрымаць інфармацыю, але і параўнаць розныя напрамкі, пабачыць адрозненні ў атмасферы факультэтаў і зразумець, дзе ўзнікае адчуванне «свайго» месца. Менавіта ў гэтым кантэксце асабістыя ўражанні і жывыя эмоцыі важнейшыя за сухія факты.**






## СТУДЭНТЫ – АБІТУРЫЕНТАМ: ДАПАМОГА З ПЕРШЫХ РУК

Важную ролю ў арганізацыі такіх мерапрыемстваў іграюць студэнты-валанцёры. Для многіх з іх удзел у днях адчыненых дзвярэй – гэта спосаб вярнуць тую падтрымку, якую яны самі атрымалі некалькі гадоў таму.

Студэнт першага курса факультэта філасофіі і сацыяльных навук, будучы псіхолаг, Яраслаў Кірычук узгадвае, што яго ўласнае знаёмства з факультэтам пачалося менавіта з такога мерапрыемства:

*– Я стаў валанцёрам, таму што памятаю, як у свой час сам абітурыентам прыйшоў на факультэт на дзень адчыненых дзвярэй. Тады мне вельмі дапамаглі: падказалі, куды ісці, распавялі, што і дзе будзе праходзіць. Цяпер я хачу дапамагчы іншым,* – распавядае Яраслаў.

У дзень мерапрыемства валанцёры суправаджаюць гасцей, дапамагаюць арыентавацца ў будынку, знаходзіць аўдыторыі для майстар-класаў, адказваюць на пытанні і ўдзельнічаюць у самых занятках. Для абітурыентаў гэта асабліва важна: зносіны са студэнтамі здымаюць напружанне і разбураюць вобраз «недаступнага» ўніверсітэта.

## ВЕДЫ ПРАЗ ВОПЫТ

Менавіта жывыя зносіны і асабістыя ўражанні становяцца для многіх вырашальным фактарам у выбары будучай спецыяльнасці. Ксенія Новікава, вучаніца 10 класа з Маладзечна, прызнаецца, што пакуль не вызначылася канчаткова, але дзень адчыненых дзвярэй дапамог ёй лепш зразумець свае інтарэсы:

*– Пакуль дакладна не ведаю, ці буду паступаць на ФФСН. Я прыехала паглядзець на спецыяльнасць «сацыялогія». Яна пра ўсё, і таму мне спадабалася. Тут мне таксама сказалі, што гэта шырокая спецыяльнасць, і гэта пацвердзіла маю думку. Якраз такое мне і трэба,* – дзеліцца Ксенія.

Па яе словах, ніякая інфармацыя на сайце не можа замяніць асабістай прысутнасці:

*– Мне важна прыехаць ва ўніверсітэт, а не проста пачытаць пра яго. Цікава пагутарыць з людзьмі, убачыць іх, даведацца шчырае меркаванне. Я была яшчэ на дні адчыненых дзвярэй факультэта міжнародных адносін – там зусім іншая атмасфера, больш афіцыйная. На ФФСН усё па-іншаму, больш расслаблена. Гэта дапамагае адчуць адрозненні. Такія мерапрыемствы сапраўды дапамагаюць зрабіць выбар.*



Ксенія адзначае, што сярод яе аднакласнікаў такія паездкі пакуль не вельмі папулярныя, аднак для яе гэта магчымасць не толькі даведацца пра прафесію, але і пашырыць кола зносін, пазнаёміцца з новым горадам і ўніверсітэцкім асяроддзем.

## СВЯДОМЫ ВЫБАР ПАЧЫНАЕЦЦА З СУСТРЭЧЫ

У юрыдычным каледжы БДУ фармат зносін з абітурыентамі выбудаваны максімальна інфарматыўна.

Намеснік дырэктара па вучэбнай працы юрыдычнага каледжа БДУ Ніна Урублеўская падкрэслівае, што галоўная задача такіх сустрэч – дапамагчы зрабіць усвядомлены выбар:

*– Я раблю прэзентацыю каледжа і праводжу інфармаванне па паступленні. Складанага ў працы з абітурыентамі нічога няма, гэта цікава – дапамагаць людзям вызначыцца. Фармат звычайна традыцыйны, таму што конкурс вялікі і абітурыентам патрэбная канкрэтная інфармацыя,* – адзначае яна.

Па словах Ніны Урублеўскай, ніякая інфармацыя на сайце не можа замяніць асабістай прысутнасці. Нават самы падрабязны сайт, прэзентацыі і відэаролікі не даюць поўнага ўяўлення пра тое, якім на самай справе з'яўляецца факультэт і ўніверсітэт у цэлым. Асабістая прысутнасць дазваляе ўбачыць аўдыторыі, паназіраць за зносінамі студэнтаў і выкладчыкаў, адчуць тэмп і рытм універсітэцкага жыцця. Менавіта ў такіх дэталях фарміруецца сапраўднае ўражанне, і яго немагчыма атрымаць праз экран. Акрамя таго, магчымасць задаць пытанне наўпрост і адразу атрымаць жывы, шчыры адказ дапамагае абітурыентам пазбавіцца ад сумненняў і страхаў, якія часта суправаджаюць выбар будучай прафесіі:

*– Адна справа – пачытаць на сайце, і зусім іншая – прыйсці, убачыць, дзе знаходзіцца навучальная ўстанова, паглядзець на навучальны працэс, пранікнуцца ўніверсітэцкім духам. Гэта вельмі карысна. І, вядома, пазней я бачу ў спісах залічаных навучэнцаў тых, хто наведваў дні адчыненых дзвярэй.*

## КАЛІ ВАЖНА НЕ ТОЛЬКІ ЧАМУ, АЛЕ І З КІМ ВУЧЫШСЯ

Для старшакласнікаў, якія ўжо вызначыліся з напрамкам, такія мерапрыемствы становяцца вырашальным пунктам ва ўласным выбары. Абітурыентка факультэта журналістыкі Паліна Саўлоўская прызнаецца, што пасля дня адчыненых дзвярэй яе сумневы зніклі канчаткова:

*– Маё меркаванне пра БДУ моцна змянілася: я канчаткова пераканалася ў выбары спецыяльнасці. Я больш падрабязна даведалася пра асаблівасці ўступных экзаменаў і жыццё факультэта. З'явілася матывацыя яшчэ больш рыхтавацца да ЦЭ і ЦТ, а таксама да ўступных выпрабаванняў,* – кажа Паліна.

Асаблівае значэнне для яе мелі зносіны са студэнтамі і выкладчыкамі. Па словах Паліны, такія размовы аказаліся не проста інфарматыўнымі, але і псіхалагічна важнымі. Студэнты дзяліліся асабістым вопытам паступлення, распавядалі пра першыя цяжкасці і дасягненні, пра тое, як праходзіць вучоба і жыццё па-за вучобай. Гэта дазволіла ўбачыць рэальны шлях ад абітурыента да будучага спецыяліста і зразумець, што ўсе этапы – пераадольныя. Выкладчыкі, у сваю чаргу, дапамаглі сфарміраваць уяўленне пра ўзровень патрабаванняў, падыход да навучання і зацікаўленасць у студэнтах. Усё гэта стварыла адчуванне адкрытасці і падтрымкі, асабліва каштоўнае на этапе прыняцця рашэння:

*– Гэта было вельмі карысна. Асабліва зносіны са студэнтамі, бо літаральна пару гадоў таму яны былі ў такім жа становішчы, як я цяпер. Пасля размоў мне стала больш спакойна. Гэтыя людзі стараліся паступіць, вучыліся, пісалі матэрыялы, і ў іх атрымалася. Спадзяюся, што ў мяне таксама атрымаецца.*

Кажучы пра крытэрыі выбару ўніверсітэта, Паліна падкрэслівае не толькі ўзровень адукацыі, але і атмасферу. Для яе важна адчуваць сябе часткай супольнасці, дзе цэняць ініцыятыву, узаемную падтрымку і прафесійны рост. Атмасфера даверу і ўцягнутасці, пра якую гавораць і студэнты, і выкладчыкі, фарміруе жаданне не проста вучыцца, а развівацца, спрабаваць сябе ў прафесіі яшчэ падчас навучання. Калі факультэт успрымаецца як вялікая каманда аднадумцаў, узнікае ўнутраная матывацыя працаваць больш старанна і імкнуцца да высокіх вынікаў. Менавіта такое спалучэнне моцнай акадэмічнай базы і цёплага ўніверсітэцкага асяроддзя стала для Паліны вырашальным:

*– Калі выкладчыкі і студэнты кажуць, што журфак – гэта адна вялікая сям'я, вельмі хочацца стаць яе часткай. У журфака БДУ шмат паспяховых выпускнікоў, а гэта значыць, што тут даюць моцныя веды. Мне хочацца стаць добрым спецыялістам у сферы журналістыкі.*

Гісторыі абітурыентаў, студэнтаў і арганізатараў паказваюць: дзень адчыненых дзвярэй – гэта не фармальнае мерапрыемства, а важны этап на шляху да будучай прафесіі. Тут сустракаюцца чаканні і рэальнасць, фарміруюцца першыя ўніверсітэцкія сувязі і з'яўляецца ўпэўненасць ва ўласным выбары.

Дні адчыненых дзвярэй у Беларускім дзяржаўным універсітэце будуць праходзіць да красавіка ўключна. Актуальную інфармацыю пра даты і фармат мерапрыемстваў на канкрэтных факультэтах можна знайсці на афіцыйным сайце БДУ.

**Ксенія СМІРНОВА**

УНІВЕРСІТЭТ
29 студзеня 2026 года, №1 (2905)

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска–выкладчыцкага складу

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | На пасаду загадчыка кафедры прызначаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, навуковую ступень доктара ці кандыдата навук, навуковыя працы, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў |
| | [2] Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| | [3] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, навуковыя працы ці вынаходствы, патэнты, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| **Прафесар** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў |
| **Дацэнт** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў |
| | [4] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| | [5] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| | [6] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, нямецкай мовай а таксама, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| **Старшы выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў |
| | [7] Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| | [8] Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, што адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| **Выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 1 год; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| | [9] Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 1 год; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай а таксама, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

**Факультэт журналістыкі аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання | 2 гады |
| Дацэнт кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання | 3 гады |
| Дацэнт кафедры тэлебачання і радыёвяшчання | 2 гады |
| Дацэнт кафедры медыялогіі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю | - |
| Старшы выкладчык кафедры міжнароднай журналістыкі | - |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 301; да 27 лютага.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 323; да 29 сакавіка.

**Эканамічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Старшы выкладчык кафедры фінансавага кантролю, аналізу і аўдыту | - |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 27 лютага.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 29 сакавіка.

**Факультэт сацыякультурных камунікацый аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў [2] | 1 год |
| Загадчык кафедры тэорыі і практыкі перакладу [3] | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў [4] | 1 год |
| Дацэнт кафедры дызайну моды [5] | 1 год |
| Дацэнт кафедры камп’ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі [5] | |
| Дацэнт кафедры культуралогіі [5] | |
| Дацэнт кафедры камунікатыўнага дызайну [5] | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры тэорыі і практыкі перакладу [5] | |
| Дацэнт кафедры нямецкай мовы [6] | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаўі [7] | - |
| Старшы выкладчык кафедры камунікатыўнага дызайну [8] | - |
| Старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі перакладу [8] | |
| Старшы выкладчык кафедры мастацтваў і асяроддзевага дызайну [8] | |
| Выкладчык кафедры мастацтваў і асяроддзевага дызайну | - |
| Выкладчык кафедры дызайну моды | |
| Выкладчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў [9] | - |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Акадэміка Курчатава, д. 5, кабінет 208; да 27 лютага.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Акадэміка Курчатава, д. 5, кабінет 409а; да 29 сакавіка.

## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

**АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД:**

Загадчыка навукова-даследчага сектара кібербяспекі.
Загадчыка навукова-даследчай лабараторыі прыкладной інфарматыкі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб’явы.
Адрас: 220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, п. 427,
НДІ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі,
тэл. 209-51-04.

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі | 1 год |
| Дацэнт кафедры сацыяльнай камунікацыі | 1 год |
| Загадчык кафедры сацыялогіі | 1 год |
| Прафесар кафедры сацыялогіі | 3 гады |
| Прафесар кафедры сацыялогіі | 2 гады |
| Дацэнт кафедры сацыялогіі | 1 год |
| Прафесар кафедры філасофіі культуры | 3 гады |
| Дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі | 1 год |
| Дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі | 2 гады |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; да 27 лютага.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; да 29 сакавіка.

# АСЦЯРОЖНА, ГАЛАЛЁД!

З надыходам зімы звыклы рытм горада змяняецца, а прагулкі на свежым паветры пачынаюць патрабаваць асаблівай пільнасці. Капрызнае надвор’е з яго рэзкімі перападамі тэмператур і ледзянымі дажджамі ператварае вуліцы ў зону павышанай рызыкі, дзе кожны неасцярожны крок можа стварыць непрыемнасці. Галалёд падступны: ён хаваецца пад тонкім пластом свежага снегу або маскіруецца пад звычайны мокры асфальт, становячыся галоўнай прычынай сезоннага траўматызму. Каб зімовыя будні заставаліся бяспечнымі, а паход на працу або ў краму не скончыўся ў кабінеце ўрача, важна загадзя ўзброіцца ведамі пра правілы паводзін на слізкай дарозе.

Часцяком тэмпературныя змены прыводзяць да таго, што на паверхні зямлі, на тратуарах, праезных частках вуліцы ўтвараецца пласт шчыльнага лёду, які ўтойвае ў сабе небяспеку. У сувязі з гэтым у дадзеную пару года павялічваецца колькасць траўмаў і пераломаў.

Галалёд ператварае вуліцы ў вялікі каток. Паслізнуцца і ўпасці можна на кожным кроку.

У такіх выпадках заўсёды памятайце пра бяспеку:

- калі ў прагнозе надвор’я даецца паведамленне пра галалёд, прыміце меры для зніжэння верагоднасці атрымання траўмы. Падрыхтуйце някоўзкі абутак, прымацуйце на абцасы металічныя набойкі ці паралон, а на сухую падэшву наляпіце лейкапластыр ці ізаляцыйную стужку;
- перасоўвайцеся асцярожна, не спяшаючыся, абапіраючыся на ўсю падэшву. Пажылым людзям рэкамендуецца выкарыстоўваць палку з гумовым наканечнікам ці спецыяльную палку з завостранымі шыпамі;
- выбірайце бяспечны маршрут: пасыпаныя пяском ці соллю дарожкі, участкі, цалкам ачышчаныя ад наледзі;
- дзе магчыма, трымайцеся за поручні, сцены ці іншыя апоры;
- не трымайце рукі ў кішэнях – гэта павялічвае верагоднасць падзення і атрымання траўмаў;
- будзьце асабліва асцярожнымі пры пераходзе дарогі.

Калі вы ўсё-такі паслізнуліся:

- пры падзенні варта злёгку прысесці – гэта зменшыць вышыню падзення і дапаможа змякчыць удар;
- цягліцы варта напружыць, так вы абароніце косткі ад удару;
- не выстаўляйце рукі наперад і не падайце з усёй сілы на спіну і ягадзіцы, аптымальным варыянтам стане перакочванне ці падзенне на бок. Падаючы на спіну, абараніце галаву рукамі, пры гэтым рукі сагніце ў локцях і прыцісніце да цела;
- не спяшайцеся падняцца, спачатку пераканайцеся, што не атрымалі сур’ёзных пашкоджанняў;
- калі не можаце падняцца самастойна, звярніцеся па дапамогу да прахожых;
- калі вы ўпалі ў бязлюдным месцы, то спачатку ўстаньце на карачкі і толькі потым павольна паднімайцеся. Лепш будзе, калі вы знойдзеце нейкі прадмет для апоры.

Пры атрыманні траўмы неадкладна звярніцеся ў траўматалагічны пункт.

Пры ўзнікненні болю не рухайцеся, выклічце хуткую дапамогу па тэлефоне «103».

МНС нагадвае: каб пазбегнуць траўмаў, прытрымлівайцеся простых правілаў паводзін падчас галалёду!

**Кастрычніцкі РАНС**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 29.01.2026 г.
Зак. 66. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; gazeta.bsu.by*